# ЧЫТАЦКАЯ АЎДЫТОРЫЯ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАГА МІНСКА: ПОГЛЯД З ВІЛЬНІ

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

Даследуюцца публікацыі друку, прысвечаныя вывучэнню чытацкай аўдыторыі жыхароў дарэвалюцыйнага Мінска.

***Ключавыя словы:*** рускамоўная прэса; польскія выданні; чытацкая аўдыторыя; канфесійны друк; палітычныя партыі і рухі.

# THE READERSHIP OF PRE-REVOLUTIONARY MINSK: A VIEW FROM VILNA

***P. L. Doroshchenok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. L. Doroshchenok (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The publications of the press devoted to the study of the readership of residents of pre-revolutionary Minsk are investigated.

***Key words:*** Russian-language press; Polish publications; readership; confessional press, political parties and movements.

Час пасля заканчэння Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гг. увайшоў у гісторыю як перыяд сталыпінскай рэакцыі. Дэмакратычныя пераўтварэнні, якія на кароткі час выклікалі да жыцця дзясяткі перыядычных выданняў, змяніліся на ганенні супраць свабоды слова, мітынгаў, шэсцяў і інш. Ажыўленне ў беларуска-літоўскім краі нацыянальных рухаў – беларускага і літоўскага – з трывогай успрымалі як у польскім, так і расійскім асяродках. З’яўленне новых палітычных пар-

тый і рухаў, а таксама заснаваных імі перыядычных выданняў пэўным чынам парушала баланс сіл, які склаўся на беларускай зямлі напрыканцы XIX – пачатку XX ст. Публіцысты Вільні – аднаго з найбуйнейшых гарадоў на паўночна-заходняй ускраіне Расійскай імперыі – спрабавалі ў міжрэвалюцыйны час вызначыць перспектывы далейшай палітычнай будучыні краю.

Асабліва непакоіліся польскія палітыкі і публіцысты, якія, як яны самі лічылі, абаранялі заваёвы польскай культуры на ўсходніх рубяжах былой Рэчы Паспалітай. Сярод недзяржаўных народаў Усходняй Еўропы рэгіянальнае лідарства па тэмпах разгортвання нацыятворчых працэсаў захапілі палякі. Фарміраванне сучаснай польскай нацыі ў пачатку XX ст. суправаджалася з'яўленнем палітычных партый і арганізацый, адной з найбуйнейшых была Польская ліга (1887 г.), з якой вырасла Польская дэмакратычна-нацыянальная партыя (1897 г.). У 1899 г. яна легалізавалася, а ў 1903 г. была прынята новая праграма, яе галоўнай мэтай была незалежнасць Польшчы. ПДПН распаўсюджвала свае ўплывы і на тэрыторыі Літвы і Беларусі, каб не застацца, як лічыў ідэолаг Р. Дмоўскі, без большай часткі польскіх земляў [1, с. 36].

Праваднікам польскіх інтарэсаў у беларуска-літоўскім краі была і віленская газета «Kurier Litewski». У 1908 г. на старонках выдання з'явілася публікацыя «Echa mińskie», у якой ананімны аўтар, верагодней за ўсё, штатны супрацоўнік рэдакцыі, падрабязна аналізаваў статыстыку мінскіх падпісчыкаў розных тагачасных выданняў – расійскіх, польскіх, яўрэйскіх і інш. Найбольшай папулярнасцю ў мінчукоў карысталіся пецярбургскія «Биржевые ведомости» (другое выданне), паштовая служба горада атрымлівала 535 экзэмпляраў газеты. Так званае другое выданне, якое выходзіла з 1893 г., было значна таннейшым, чым асноўнае (падпіска на год – 4 рублі супраць 15) і выходзіла для масавага чытача, які ў асноўнай сваёй масе пражываў у правінцыі.

Наступным па папулярнасці сярод жыхароў Мінска выданнем з'ўлялася «Нива» (Санкт-Пецярбург) – рускі штотыднёвы ілюстраваны часопіс – 201 экзэмпляр. Трэцяе месца займала «Рэформа» (173 экз.) – штодзённая пецярбургская грамадская, культурна-палітычная і літаратурная газета, нумар выдання ў правінцыі каштаваў 3 кап. Газета «Новое время» (136 экз.) мела рэпутацыю сервільнага, рэакцыйнага і беспрынцыпнага выдання, а слова «нововременец» станавілася хадзячай назвай. Гэта было звязана з антысеміцкімі выступленнямі на старонках газеты ў сувязі са справай Дрэйфуса і г. д.

Яшчэ менш падпісчыкаў было ў наступных расійскіх газет: «Русь» (99 экз.), «Слово» (98 экз.), «Столичная почта» (84 экз.), «Речь» (51 экз.), «Правительственный вестник» (50 экз.), «Русские ведомости» (45 экз.), «Слово» (37 экз.). І літаральна адзінкавыя экзэмпляры атрымлівалі падпісчыкі ўрадавага афіцыёзу – «Вече» (18 экз.), «Московские ведомости» (5 экз.). Не карысталіся масавым попытам у мінскіх жыхароў і правінцыяльныя газеты: «Виленский вестнік» (6 экз.), «Киевлянин» (3 экз.), «Русское знамя» (9 экз.) [2].

Адзнаючы невялікую, у параўнанні з колькасцю яўрэйскага насельніцтва ў Мінску, падпіску на выданні «Der Fraind» (117 экз.) «Hazman» (54 экз.), аўтар даваў падрабязную характарыстыку сітуацыі спраў з польскімі выданнямі. Лідарамі сярод польскамоўнай прэсы ў губернскім цэнтры з’яўляліся «Kurjer Polski» (56 экз.), «Kurjer Warszawski» (52 экз.), «Gazeta Codzienna» (47 экз.), «Goniec» (40 экз.), «Ŝwiat» (28 экз.), «Tygodnik ilustrowany» (30 экз.). Не былі абыдзены ўвагай і такія незапатрабаваныя польскай грамадскасцю ў Мінску выданні, як «Slowo» (9 экз.), «Ziarno» (9 экз.), «Przyjaciel Dzieci» (9 экз.), «Nowa Gazeta» (11 экз.), «Kraj» (36 экз.), «Tygodnik Mód» (11 экз.), «Dziennik Kijowski» (2 экз.) і «Kresy» (1 экз.). У ліку замежных газет, якія атрымліваліся па пошце, называліся «Nowa Reforma» (2 экз.), «Czas» (1 экз.) і «Dziennik Poznański» (2 экз.).

Вынікі даследавання аўтар артыкула падбіваў досыць тэндэнцыйна – колькасць мінскіх падпісчыкаў на рускамоўныя выданні ледзь дасягала лічбы 800, хаця прыведзеныя ў яго ж публікацыі паказчыкі значна перавышалі 1500 нумароў. Палякаў у Мінску, па меркаванні віленскага журналіста, пражывала не менш за 25 000 чалавек (пэўна, з улікам беларусаў-каталікоў. – *П. Д.*). Сярод іх налічвалася прыкладна 350–400 чытачоў польскамоўнай прэсы, што давала прырост, у параўнанні з ранейшымі лічбамі пяці-сямігадовай даўнасці, на 50–100 асоб.

Погляд з Вільні на колькасць чытачоў аказаўся вельмі блізарукім і прадузятым. Для аб’ектыўнасці варта было б назваць імклівы рост чытачоў віленскай газеты «Наша ніва», якая за першыя гады існавання набыла шырокую вядомасць у беларуска-літоўскім краі. М. Багдановіч пісаў: «Чтобы дать понять, какой массовый характер приняла эта деятельность, укажу, что еще в 1910 году в “Нашей ніве” приняло участие в качестве сотрудников около 400 человек» [3, с. 18]. Гэтыя факты былі не на руку праціўнікам беларускага руху, якія ўсяляк тармазілі нацыятворчыя працэсы, у лепшым выпадку абыходзячы іх маўчаннем. А такія

выданні, як «Вестник Виленского св.-духовского братства», бачылі ў дзейнасці «Нашай нівы» небяспеку: нібыта газета і яе супрацоўнікі жадаюць «отщепить белорусскую ветвь от национального русского ствола» [4, с. 121].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Дарашчонак П.* Максім Багдановіч пра фарміраванне нацыянальнай ідэалогіі беларускага народа // Роднае слова. 2021. № 11. С. 36–39.
2. *Богданович М.* Белоруссы / Национальные проблемы. 1915. № 2. С. 17–19.
3. Echa mińskie // Kurier Litewski. 1908. № 17.
4. Православный белорусс. Белоруссы и “белоруссы” // Вестник Виленского св.-духовского братства. 1914. № 8. С. 121–123.